# Бабулі не хапае на патэльню...



## Інфармацыя для разважанняў

Здавалася б, пенсіянеры цікавяцца крэдытамі куды менш, чым моладзь. Ім не трэба купляць жыллё, новыя машыны яны набываюць за грошы ад продажу чагосьці старога. Аднак банкі не абмінаюць іх сваёй увагай. Таму што пенсіянеры — адзіная ў краіне вялікая група насельніцтва з гарантаваным прыбыткам.

І мы разгледзім варыянты крэдытаў для тых, хто пайшоў на заслужаны адпачынак. Усе банкаўскія пазыкі для пенсіянераў можна падзяліць на дзве няроўныя катэгорыі: крэдыты, якія выдаюць толькі пенсіянерам, і крэдыты, якія даступныя ўсім, але добра падыходзяць пенсіянерам. Для афармлення першых патрэбен статус пенсіянера. Гаворка не пра ўзрост, а пра наяўнасць пенсійнага пасведчання. Гэта асаблівая выгадна для маладых пенсіянераў: ваенных і іншых катэгорый, для якіх пенсійны ўзрост надыходзіць раней. Іншыя крэдыты выдаюцца без абмежаванняў, але пенсіянеры маюць па іх ільготныя ўмовы: паніжаны працэнт, бясплатныя дадатковыя паслугі і яшчэ шмат чаго.

## Чым адрозніваюцца крэдыты для пажылых?

Пенсіянерам прапануюць пазыкі з рознымі ўмовамі. Але з улікам пенсійнай спецыфікі яны часта маюць паніжаны першы ўзнос (усё ж такі з пенсіі цяжка сабраць буйную суму) і меншы тэрмін пагашэння (або абавязковае вяртанне да пэўнага ўзросту). У іх простае і хуткае афармленне (пенсіянераў лягчэй праверыць і падлічваць даход і працэнты).

Аднак гэта агульныя і неабавязковыя ўмовы, разбірацца ў пенсійных крэдытах лепш на канкрэтных прыкладах. Такім чынам, пачалі. Карта растэрміноўкі «Халва» ад аднаго камерцыйнага банка. Класічная і самая вядомая ў краіне карта растэрміноўкі. Выдаецца мужчынам да 64 гадоў, а жанчынам да 70. Галоўныя вартасці карты «Халва» — не спецыяльныя ўмовы для пенсіянераў (іх няма), а растэрміноўка і найшырэйшы спіс крам-партнёраў. Мінус — мужчыны ў іх ужо надта хутка «старэюць».

## «Час жыць» у крэдыт

А вось гэта ўжо спецыяльны прадукт для пенсіянераў ад іншага буйнога банка. Каб яго аформіць, трэба пенсійнае пасведчанне і даведка аб велічыні пенсіі. «Час жыць» — спажывецкі крэдыт пад 13 % або 13,5 % гадавых з закладам маёмасці або паручыцельствам. Тэрмін крэдытавання да 1 года (пад меншы працэнт) або да 3 гадоў (па большай стаўцы). «Час жыць» выдаецца ўдзельнікам клуба «Аксаміт». Па ключавых умовах гэта класічны крэдыт на спажыванне з дадатковымі магчымасцямі.

Ёсць і прадукты іншага плана. Напрыклад, крэдыт «Афіцэрскі» выдаецца на спажывецкія патрэбы супрацоўнікам сілавых ведамстваў, а таксама пенсіянерам гэтых структур, якія яшчэ не дасягнулі агульнадзяржаўнага пенсійнага ўзросту. Гадавая стаўка — 13 %. Не патрабуе залогу і паручыцельства. Нядрэнна, але нам не сюды.

А вось буйны сеткавы рытэйлер прыдумаў крэдытны прадукт для трымальнікаў сваёй карты зніжак. Крэдыт афармляюць толькі да 67 гадоў, але па іншых умовах ён выдатна падыходзіць пенсіянерам. Патрэбен даход больш за 200 рублёў у месяц і не трэба закладу. Калі кліент згодны застрахавацца, то няма патрэбы і ў паручыцелях. Максімальная сума — да 2500 рублёў. Тэрмін — да 1 года. Стаўка — ад 10 % гадавых.

Крэдыт «Сацыяльны» — гэта ўжо спецыяльны прадукт для пенсіянераў, яго можна аформіць толькі па пенсійным пасведчанні. Дзіўна, але грошы даюць без закладу і без паручыцеляў. Стаўка — 13,81 % гадавых. Максімальная сума — 2500 рублёў. Максімальны тэрмін — 3 гады.

Яшчэ адзін прадукт для мэтавай аўдыторыі — крэдыт «Пенсійны». Ён выдаецца толькі пенсіянерам па ўзросце і пенсіянерам сілавых ведамстваў — трэба пенсійнае пасведчанне. Узрост на момант пагашэння пазыкі — 68 гадоў для мужчын, 63 для жанчын. Максімальны тэрмін крэдытавання — 5 гадоў. З гэтага вынікае, што пенсіянер па ўзросце можа атрымаць такі крэдыт адзін раз, прычым у год выхаду на пенсію. Стаўка — 20 % гадавых, выдача наяўнымі або пераводам на рахунак. Падобны на яго банкаўскі прадукт «Пенсійны прэміум» — па ўмовах гэты крэдыт нагадвае папярэдні, але апраўдвае прыстаўку «прэміум» павышэннем узроставай планкі. І мужчыны, і жанчыны могуць крэдытавацца з такім разлікам, каб пагасіць крэдыт да 70 гадоў. Гадавая стаўка значна вышэйшая — 24 % гадавых.

## Ёсць хітры крэдыт

Пазыкі для пенсіянераў нельга параўнаць з ільготнымі крэдытамі для маладых сем'яў, дзе працэнтныя стаўкі бываюць у разы ніжэйшыя. Працэнты на пенсійных крэдытах бываюць толькі трохі меншыя, чым звычайна, а могуць быць проста вялікія, калі ў банка ёсць рызыка страціць грошы. Наогул пазыковыя грошы для пенсіянераў — гэта проста крэдыты на агульных падставах, з некаторымі бонусамі і дадатковымі магчымасцямі.

Аднак атрыманне спецыяльных крэдытаў для пенсіянераў не патрабуе асаблівых высілкаў і выдаткаў. Наадварот — іх хутка і лёгка афармляюць. Працэнт адабрэнняў па такіх крэдытах даволі высокі. Таму тым, хто мае права на спецыяльны крэдыт для пенсіянераў, лепш выбраць менавіта яго, а не крэдыт на агульных падставах.

Але ёсць некалькі банкаў, якія пры выдачы крэдытаў абсалютна не глядзяць на ўзроставы цэнз — бярыце крэдыт хоць у 80! Але ж працэнты ў такім выпадку проста зашкальваюць. І яшчэ спецыяльнай умовай па такіх крэдытах з'яўляецца тое, што ў выпадку смерці крэдытаатрымальніка даўгі яго пераходзяць як па спадчыне блізкім сваякам. А гэта ўжо сур'ёзна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Гатовыя вучыцца ў свае 60+?

## А можа, хочаце вучыць іншых...

**Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту рыхтуецца да ўступнай кампаніі. У гэтым навучальным годзе ён плануе прыняць на навучанне 700 чалавек. Вучоба пачнецца з 14 кастрычніка.**



Фота Віктара СКОРСКАЙ.

**Праект «Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту» рэалізуе грамадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў» пры падтрымцы кампаніі JTI і Мінгарвыканкама.**

Каб падаць дакументы, з сабой неабходна прынесці пенсійнае пасведчанне. Перавагу пры залічэнні будуць мець пенсіянеры, гатовыя зрабіць свой унёсак у праект і якія раней не навучаліся ва ўніверсітэце трэцяга ўзросту. Навучанне бясплатнае. Узрост слухачоў — 60+.

Прыём дакументаў на 2019/2020 навучальны год будзе праходзіць па адрасе: праспект Машэрава, 8.

25 верасня з 12.00 да 17.00.

26 верасня з 10.00 да 17.00.

* * *

Таксама да 1 кастрычніка працягнецца фарміраванне каманды валанцёраў-выкладчыкаў.

«Кожны год у нашым праекце працуе больш за сто валанцёраў. Гэта не толькі студэнты, але і працуючыя спецыялісты, пенсіянеры. Валанцёр можа праводзіць заняткі з кастрычніка да мая з замацаванай за ім групай ці чытаць разавыя лекцыі, праводзіць майстар-класы, трэнінгі, — адзначае **куратар вучэбнай групы ўніверсітэта трэцяга ўзросту Вольга ШЫШЛО.** — Дыплом выкладчыка і педагагічны вопыт не патрабуюцца. Галоўнае — гэта жаданне падзяліцца ведамі і ўменнямі».

Сёлета ўніверсітэт трэцяга ўзросту запрашае валанцёраў для правядзення курсаў па замежных мовах, беларускай мове, аратарскім майстэрстве, танцавальным і спартыўным кірунках, псіхалогіі, акцёрскім майстэрстве, фоташопе і відэамантажы, экскурсазнаўстве, модзе і стылю. Можна прапанаваць уласны курс — праект адкрыты да новых ідэй і гатовы іх падтрымаць.

Адправіць заяўку можна на адрас 3-age@basw-ngo.by

**Святлана БУСЬКО.**

# EdCamp Belarus 2019: пра надзённае без фармалізму

**Трэцяя (не)канферэнцыя беларускіх педагогаў EdCamp Belarus 2019 пройдзе 12—13 кастрычніка.**

EdCamp мае ўнікальны фармат — (не)канферэнцыя падпарадкоўваецца «закону аб дзвюх нагах»: яе праграма загадзя невядомая, удзельніцы і ўдзельнікі самастойна вызначаюць ход мерапрыемства і далучаюцца да той дыскусіі, якая цікавая менавіта ім. Праграма фактычна ствараецца разам зыходзячы з інтарэсаў кожнага. І кожны можа стаць спікерам.

Фармат «ЭдКэмпа» гарантуе, што кожная вартая ўвагі педагагічная ідэя будзе пачутая. Усе могуць агучыць праблему і шляхі яе вырашэння паводле ўласнага досведу, правесці майстар-клас, а могуць проста прагаласаваць за тое, што хочуць пачуць. Галоўны прынцып — «дай, калі можаш, вазьмі — калі хочаш».

У кожнага з удзельнікаў будзе 60 секундаў, каб прэзентаваць сваю ідэю. Падчас першага беларускага «ЭдКэмпа» ў 2017 годзе педагогі прапанавалі амаль 20 сваіх тэм. Летась было агучана ўжо 40 ідэй. З іх па выніках галасавання, якое адбывалася з дапамогай стыкераў (у кожнага ўдзельніка была магчымасць вызначыць для сябе трох фаварытаў), адабралі трынаццаць.

Education Camp (EdCamp) — міжнародная ініцыятыва, якая нарадзілася ў настаўніцкім асяроддзі ў ЗША ў 2010 годзе. А ў 2017-м Беларусь стала 26-й краінай свету, на якую пашырылася эдкэмп-супольнасць. Сёлета на EdCamp у Беларусь запрасілі гасцей з Вялікабрытаніі, Польшчы, Японіі, Чэхіі.

Арганізатарамі EdCamp Belarus выступаюць Мінскі Хаб глабальных архітэктараў будучыні (Global Shapers) і Таварыства беларускай школы.

— Адукацыя — гэта не сфера абслугоўвання, як часта можна пачуць ад беларускіх бізнесменаў. Яна павінна найперш выконваць сацыяльны заказ грамадства, замову бацькоў, саміх навучэнцаў, з'яўляцца сродкам пабудовы грамадзянскай супольнасці, — разважае **намеснік старшыні Таварыства беларускай школы Тамара МАЦКЕВІЧ.** — Менавіта такімі аргументамі кіраваліся настаўнікі, калі выбіралі агульную тэму для EdCamp Belarus 2019 — «Супрацоўніцтва дзеля будучыні».




Супрацоўніцтва лічыцца адным з чатырох галоўных навыкаў XXI стагоддзя (Collaboration, Communication, Critical Thinking and Creativity). Супрацоўніцтва для паляпшэння адукацыі прапануецца разглядаць на трох узроўнях, таму і мэта, пастаўленая перад EdCamp Belarus 2019, складаецца з трох частак.

Па-першае, гэта наладжванне супрацоўніцтва паміж усімі сектарамі: дзяржавай, бізнесам, грамадзянскай супольнасцю. Кожны са стэйкхолдараў робіць свой унёсак у адукацыю, не заўсёды ведаючы, што робяць іншыя, і толькі цеснае супрацоўніцтва дазволіць атрымаць чаканы эфект.

Другая мэта — пабудова супрацоўніцтва паміж школьнымі настаўнікамі. Прафесар Джон Хэці — аўтар самых аўтарытэтных даследаванняў пра кіраванне эфектыўнасцю навучання, сцвярджае, што супрацоўніцтва паміж настаўнікамі дае самы моцны эфект сярод фактараў, якія ўплываюць на якасць навучання, — ён утрая большы, чым сацыяльны статус навучэнца або стварэнне элітных школ і адмысловых праграм.

Трэцяя мэта — супрацоўніцтва паміж педагогамі і вучнямі, школьнай адміністрацыяй і настаўнікамі, настаўнікамі і бацькамі, паміж самімі вучнямі.

Менавіта такі змест EdCamp Belarus 2019 дасць сістэме адукацыі штуршок і практычныя рэкамендацыі для якасных змен у навучальным змесце, накіруе школу на фарміраванне кампетэнцый, патрэбных маладой генерацыі для паспяховага працаўладкавання, сацыялізацыі і самарэалізацыі ў глабальным інфармацыйным грамадстве.

Між іншым, EdCamp Belarus — гэта ўжо не проста ініцыятыва. Інфармацыйна-кансультацыйная ўстанова падтрымкі настаўніцкіх ініцыятыў «ЭдКэмп» 29 жніўня была ўнесена ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**